**За межамі Балонскага працэсу: стварэнне і з’яднанне нацыянальнай, рэгіянальнай і глабальнай прастор вышэйшай адукацыі**

**Заява ўдзельнікаў III Балонскага палітычнага форума**

**Бухарэст, 27 красавіка 2012**

Мы, міністры, адказныя за вышэйшую адукацыю, і кіраўнікі дэлегацый ад органаў улады, устаноў і арганізацый, прысутныя на III Балонскім палітычным форуме, пацвярджаем мэты пашырэння супрацоўніцтва і палітычнага дыялогу паміж нашымі краінамі і разнастайнымі прасторамі вышэйшай адукацыі і прызнаём значнасць гэтай падзеі для дасягнення пастаўленых мэт.

Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы вышэйшай адукацыі адыгрывае асноўную ролю ў развіцці і падтрымцы з’яднанага, устойлівага і адкрытага грамадства. Гэта прадугледжвае цвёрдую прыхільнасць да ідэі вышэйшай адукацыі як ключавога фактара развіцця дэмакратыі, абароны правоў чалавека і забеспячэння ўстойлівага росту, неабходных для глабальнага ўзнаўлення пасля эканамічнага крызісу.

III Балонскі палітычны форум прысвечаны пытанням стварэння і забеспячэння ўзаемасувязі паміж нацыянальнымі, рэгіянальнымі і глабальнымі прасторамі вышэйшай адукацыі, пры гэтым у працэсе паглыбленага абмеркавання наступных чатырох тэм аналізаваліся будычыя падыходы да дыялогу ў дадзеным кантэксце.

**Адказнасць грамадства за вышэйшую адукацыю і адказнасць вышэйшай адукацыі перад грамадствам у нацыянальным і глабальным кантэкстах.** Дадзены аспект датычыцца, у прыватнасці, выдзялення адпаведных інвестыцый і дзяржаўнага фінансавання для забеспячэння роўнадаступнай вышэйшай адукацыі, а таксама стварэння на месцах нарматыўна-прававой базы і палітычнага асяроддзя для таго, каб аўтаномныя вышэйшыя навучальныя ўстановы мелі магчымасці для выканання сваіх разнастайных місій.

Мы прызнаём важнасць актыўнага ўдзелу акадэмічнай супольнасці – студэнтаў, прафесарска-выкладчыцкага складу, супрацоўнікаў і кіраўніцтва вну – у кіраванні і развіцці вышэйшай адукацыі, якая чуйна рэагуе на сацыяльныя вымярэнні і эканамічныя патрэбы. Мы таксама падкрэсліваем важнасць стварэння адкрытых і гнуткіх адукацыйных шляхоў з тым, каб грамадзяне з розным узроўнем адукацыі і з розных сацыяльных груп мелі доступ да атрымання і завяршэння вышэйшай адукацыі.

**Глабальная акадэмічная мабільнасць: стымулы і перашкоды, баланс і дысбаланс.** Акадэмічная мабільнасць набывае ўсё большае значэнне ў забеспячэнні глабальных перспектыў, павышэнні грамадзянскай актыўнасці і забеспячэнні выпускнікоў адэкватным спалучэннем ведаў, навыкаў і кампетэнцый, якія дазваляюць больш эфектыўна адказваць на выклікі нацыянальнага, рэгіянальнага і глабальнага ўзроўняў.

Мы працягваем імкнуцца да адкрытых і празрыстых адукацыйных сістэм і больш збалансаванай мабільнасці ўнутры нашых прастор і сістэм вышэйшай адукацыі, а таксама паміж імі. Мы жадаем павысіць акадэмічны абмен ідэямі і людзьмі ў нашых рэгіёнах і ствараць інавацыйныя сеткі арганізацый.

У дадзеным кантэксце мы маем намер працягваць працу, накіраваную на скарачэнне разнастайных фактараў, якія перашкаджаюць мабільнасці паміж нашымі адукацыйнымі прасторамі, такіх як недастатковая празрыстасць кваліфікацый, фінансавыя бар'еры для студэнтаў, праблемы акадэмічнага і прафесійнага прызнання, а таксама бар'еры адміністрацыйнага характару.

У межах Азіяцка-еўрапейскай сустрэчы (ASEM) мы выказваем удзячнасць за працу па вывучэнні таго, як рэгіянальныя канвенцыі аб прызнанні кваліфікацый у Еўропе ("Лісабонская канвенцыя Савета Еўропы/ЮНЕСКА")[1] і Азіяцка-ціхаакіянскім рэгіёне ("Такійская канвенцы")[2] могуць быць выкарыстаны для далейшага развіцця працэдур прызнання паміж гэтымі двума рэгіёнамі.

Мы будзем рабіць далейшыя намаганні для Рэалізацыі "Кіруючых прынцыпаў ЮНЕСКА/АЭСР па забеспячэнні якасці ў сферы трансмежнай вышэйшай адукацыі"[3], і той важнай ролі, якую яны адводзяць усім уцягнутым бакам у забеспячэнні якасці вышэйшай адукацыі.

Мы працягнем падтрымліваць, фінансаваць і прасоўваць акадэмічную мабільнасць, якая садзейнічае ўстойліваму развіццю нашых грамадстваў. Мы будзем стымуляваць вышэйшыя навучальныя ўстановы да далейшай распрацоўкі сумесных праграм і сумесных ступеней. У выпадку мэтазгоднасці вітаюцца ініцыятывы вышэйшых навучальных установаў, накіраваныя на максімальна эфектыўнае выкарыстанне магчымасцей мабільнасці і супрацоўніцтва, якія прапануюцца праграмамі Еўрапейскага Саюза.

**Глабальныя і рэгіянальныя падыходы да павышэння якасці вышэйшай адукацыі.** У сучасным міжнародным кантэксце мы падкрэсліваем значнасць гарантыі якасці. Мы разглядаем яе як інструмент павышэння патэнцыялу вышэйшых навучальных установаў па ажыццяўленні якаснай адукацыі, а таксама як інструмент павышэння празрыстасці і даверу.

Мы падтрымліваем высновы міжнароднай канферэнцыі па пытаннях гарантыі якасці, сумесна арганізаванай Урадам Фландрыі і Еўрапейскай Камісіяй ў снежні 2011 года. Нягледзячы на тое, што розныя краіны і рэгіёны распрацавалі розныя падыходы да гарантыі якасці, у нас падобныя праблемы і інтарэсы. Таму мы можам мець большую карысць, працуючы над пошукам рашэнняў, якія, нягледзячы на неабходнасць іх адаптацыі да нацыянальных кантэкстаў, могуць мець пад сабой адзіную аснову.

Наша мэта – далейшае развіццё надзейных і функцыянальных сістэм гарантыі якасці і садзеянне супрацоўніцтву паміж імі. Акрамя таго, мы падкрэсліваем важную ролю структур кваліфікацый і гарантыі якасці ва ўдасканаленні працэдур прызнання кваліфікацый і міжнароднай мабільнасці.

**Унёсак рэформ вышэйшай адукацыі ў павышэнне магчымасцей працаўладкавання выпускнікоў.** Адной з асноўных місій сістэм вышэйшай адукацыі з'яўляецца садзеянне доўгатэрміновым магчымасцям працаўладкавання выпускнікоў. Удасканаленне працэдур справядлівага прызнання перыядаў навучання і кваліфікацый на аснове наяўных міжнародных канвенцый будзе садзейнічаць больш цеснай узаемасувязі паміж сістэмамі вышэйшай адукацыі і глабальнай эканомікай. Мы падкрэсліваем значнасць падыходу, заснаванага на выніках навучання, як асновы для шырокага распаўсюджвання навучання на працягу ўсяго жыцця,

---

[1] Council of Europe, UNESCO (1997): The Convention on the Recognition of Qualifications concerning Higher Education in the European Region (Lisbon Recognition Convention)

[2] UNESCO (2011): Regional Convention on the Recognition of Qualifications in Higher Education (Tokyo Convention)

[3] UNESCO, OECD (2005): Guidelines for Quality Provision in Cross-Border Higher Education"

рэалізацыі працэдур прызнання і валідацыі папярэдняй адукацыі, а таксама павышэння зразумеласці кваліфікацый.

Розныя рэгіёны свету могуць вучыцца на досведзе адзін аднаго ў галіне павышэння магчымасцей працаўладкавання выпускнікоў, у прыватнасці, шляхам абмену вынікаў збору даных аб магчымасцях працаўладкавання і прыкладамі добрай практыкі.

**Далейшыя дзеянні**

Праца па ўдасканаленні і прсоўванні канцэпцыі Балонскага палітычнага форуму павінна быць працягнута з тым, каб максімальна павысіць яго патэнцыял для развіцця палітычнага дыялогу. З гэтай мэтай непасрэдна пасля Балонскага палітычнага форуму будзе праведзена яго ацэнка з улікам меркаванняў усіх дэлегацый-удзельніц. Нашай мэтай з'яўляецца ўдасканаленне агульнага разумення мэт і прынцыпаў Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (EHEA), а таксма садзеянне актыўным абменам паміж Еўрапейскай прасторай вышэйшай адукацыі і іншымі рэгіёнамі, што дазволіць умацаваць бягучыя міжнародныя ініцыятывы па развіцці інтэрнацыяналізацыі на інстытуцыянальным і нацыянальным узроўнях.

Рэгіянальны абмен досведам і ўзаемнае навучанне павінны ўмацаваць палітычныя абавязацельствы, прынятыя ў межах Балонскіх палітычных форумаў, а таксама ўцягнуць спецыялістаў-практыкаў ад вышэйшай адукацыі і прадстаўнікоў акадэмічных супольнасцей у доўгатэрміновы працэс абмену досведам у галіне палітыкі вышэйшай адукацыі. Мы маем агульнае меркаванне аб тым, што такое палітычнае супрацоўніцтва павінна быць засяроджана на разглядзе пэўных пытанняў і што яно можа, у прыватнасці, прапанаваць удзел тых краін або рэгіёнаў, якія выказалі асаблівую зацікаўленасць пэўнымі тэмамі. Мы таксама пацвярджаем, што маем намер і далей падтрымліваць забеспячэнне глабальнага дыялогу паміж студэнтамі і выкладчыкамі.

У сувязі з гэтым мы просім Назіральную групу па Балонскім працэсе (BFUG) у супрацоўніцтве з кантактнымі асобамі, указанымі ўсімі краінамі-ўдзельніцамі Форуму, працягнуць вывучэнне дадзенага пытання. Кантактныя асобы, якія прадстаўляюць розныя краіны, будуць выступаць у якасці пасярэднікаў паміж нашымі краінамі і будуць несці вынікі нашай працы ў агульную дзейнасць па выніках Балонскага палітычнага форуму.

З гэтай мэтай мы горача падтрымліваем і вітаем мерапрыемствы, запланаваныя ў межах палітычнага дыялогу для ўмацавання супрацоўніцтва, пачатак якому быў закладзены Балонскімі палітычнымі форумамі.

Наступны Балонскі палітычны форум пройдзе ў 2015 годзе ў Арменіі.